# На базе экалагічнага цэнтра і рыбалкі “Беладжыа” адбылося тэатралізаванае прадстаўленне “Масленіца”




**Сёння на базе экалагічнага цэнтра і рыбалкі “Беладжыа” адбылося тэатралізаванае прадстаўленне “Масленіца”, якое падрыхтавалі работнікі цэнтра культуры Гомельскага раёна. Першымі з зімой развіталіся і сустрэлі вясну навучэнцы і педагогі Урыцкай сярэдняй школы.**

Апошні тыдзень перад пачаткам Вялікага паста праходзіць шырокая Масленіца, калі людзі пакрысе адмаўляюцца ад мясных прадуктаў і аддаюць перавагу малочным стравам. А вось у народнай традыцыі Масленіца больш вядома як перыяд развітання з зімою і гукання вясны. Таму і атрыбуты свята – чучала, якое спальвалі, і бліны – тоўсценькія для мачанкі альбо танюсенькія карункавыя, якія найбольш смачныя з салодкімі начынкамі.


sozhnews.by


sozhnews.by




Аб усім гэтым расказалі Зіма, Баба Яга, скамарохі, Ямеля і, канечне, Вясна з Масленіцай – галоўныя героі тэатралізаванага прадстаўлення:

*– Дарэчы, кожны дзень масленічнага тыдня мае сваю назву. Напрыклад, серада – ласун (па-руску – лакомка), чацвер –разгуляй, бо пачыналіся самыя вясёлыя забавы і гульні. А нядзеля атрымала назву Дараванай, бо ў гэты дзень людзі прасілі дараваць крыўды і не трымаць на іх зла.*


sozhnews.by


sozhnews.by


sozhnews.by


sozhnews.by


sozhnews.by


sozhnews.by


sozhnews.by


sozhnews.by







Масленіца — найлепшы перыяд, каб наведаць родзічаў і сяброў, ды паласавацца блінамі, бо ў кожнай сям'і ёсць свае сакрэты

прыгатавання сонейка на патэльні.

*— Малако лею, муку засыпаю, дабаўляю алей, каб жылось весялей. Крышку солі, але не насолю, і каб жыццё было саладзей — цукру,* — дзеліцца рэцэптам смачных бліноў жыхарка вёскі Зябраўка Таццяна Майсеенка. — *Традыцыйна на Масленіцу за сталом збіраецца ўся наша вялікая сям'я: трэба ж папрасіць адзін у аднаго прабачэнння, ды пачаставацца любімай стравай з рознымі начынкамі.*

А яшчэ бліны — самы што ні на ёсць народны фастфуд: іх можна хутка прыгатаваць, і духмяныя жоўценькія кругляшы зручна есці нават на вуліцы і абавязковы атрыбут народных гулянняў. Работнікі культуры падрыхтавалі для жыхароў Гомельскага раёна нямала цікавых мерапрыемстваў падчас Масленіцы.

Так, у нядзелю, 14 сакавіка, жыхароў і гасцей Новай Гуты запрашаюць на народнае гулянне, прысвечанае развітанню з зімою і сустрэчы вясны. Тут будзе усё: гульні, песні з танцамі, і, канешне, бліны…




sozhnews.by


sozhnews.by




http://sozhnews.by